УДК 94(476):316.35«1917»

П. В. Дзядзюля, дацэнт (БДТУ)

# УСЕБЕЛАРУСКІ З’ЕЗД 1917 ГОДА І ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

У арыкуле разглядаюцца намаганні інтэлігенцыі Беларусі ў цяжкіх умовах Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйных падзей 1917 г., накіраваныя на будаўніцтва нацыянальнай, дэмакратычнай дзяржавы. 1872 дэлегаты Усебеларускага схода з незвычайным энтузіязмам, верай у лепшае будучае, пераадольваючы спрэчкі, амаль аднагалосна выказаліся за стварэнне беларускай дзяржавы, за рашэнне цяжкіх задач на гэтым шляху. На жаль, гэты парыў беларусаў не быў падтрыманы бальшавікамі.

The article reveals the tragedy of Belarus in the years of the First World War which caused the death of hundreds of thousands of people and made more than a million become refugees. The after-months of the war may have been more tragic if it were not for the activities of our national intellectuals who selflessly worked in refugee commissions and at children boarding schools, took care of the wounded, provided working places. For the needed, opened new schools where the teadring process was carried out in the native language. The intellectual elite believed in the future of Belarus, informed European peaples about the troubles of the Motherland and asked for help in building our own native state.

**Уводзіны.** Першая сусветная вайна выявіла шматлікія эканамічныя, сацыяльна-палітычныя заганы самай вялікай шматнацыянальнай азіяцка-еўрапейскай дзяржавы. З пачуццём горкай крыўды за радзіму таленавіты расійскі філосаф М. А. Бярдзяеў пісаў, што «разложение императорской России началось давно. Ко времени революции старый режим совершенно разложился, исчерпался и выдохся. Война докончила процесс разложения. Нельзя даже сказать, что февральская революция свергла монархию в России, монархия в России сама пала, ее никто не защищал, она не имела сторонников» [1].

Народы імперыі пасля пэўнай разгубленасці сталі шукаць свае шляхі да самастойнага існавання. Часовы ўрад, які абвясціў многія свабоды, марудзіў з рашэннем нацыянальных праблем.

**Асноўная частка.** Паражэнні на франтах, разруха ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, наступленне голаду падштурхоўвалі нацыянальныя эліты да рашучых дзеянняў. Усюды ўзнікалі грамадска-палітычныя арганізацыі, выдаваліся газеты, лістоўкі рознай палітычнай скіраванасці, дзе-нідзе ішла падрыхтоўка вайсковых падраздзяленняў.

У самых неспрыяльных умовах у гэты час аказаўся беларускі народ. Фронт падзяліў тэрыторыю Беларусі на дзве часткі. Каля 2 млн чалавек вымушаны былі з’ехаць у бежанцы далёка на ўсход Расіі. На захад ад Баранавічаў беларусы аказаліся пад нямецкай акупацыяй. Сотні тысяч маладых беларусаў знаходзіліся ў дзеючай арміі. Палітычна актыўная інтэлігенцыя аказалася распыленай па велізарнай тэрыторыі. Драматызм сітуацыі ўскладняўся і тым, што палітыкі суседніх народаў пачалі прэтэндаваць на частку тэрыторыі беларусаў. Часовы ўрад, саветы былі супраць прызнання беларусаў самастойнай нацыяй.

Бальшавікі, выкарыстоўваючы папулісцкія лозунгі, набывалі ўсё больш прыхільнікаў у асяроддзі беларускіх сялян і салдат Заходняга фронту. З дапамогай узброеных вайскоўцаў на другі дзень пасля кастрычніцкіх падзей у Петраградзе ўлада ў прыфрантавой зоне перайшла ў рукі саветаў, у дзейнасці якіх пераважалі праблемы палітычнай улады, вайны і міру, сусветнай рэвалюцыі. Нацыянальныя пытанні ў бальшавіцкім урадзе шматнацыянальнай краіны не былі прыярытэтнымі.

Кастрычніцкія падзеі выклікалі масавае дэзерцірства з франтоў. Галодныя, кепска апранутыя вайскоўцы папаўнялі харч і адзенне за кошт ужо раней абрабаваных сялян. Чыгунка ледзь паспявала прапускаць эшалоны з параненымі і хворымі, некаторыя з іх прыпыняліся ў Мінску і патрабавалі медыкаментаў, забеспячэння прадуктамі. Свяшчэннікі не паспявалі адпяваць памерлых. На Пярэсне штодзённа рыхтавалі магілы. Бежанцы, вайскоўцы, абяздоленыя павялічылі насельніцтва горада амаль у два разы. Роспач беларусаў не ведала межаў.

Інтэлігенцыя з вялікай настойлівасцю шукала шляхі да ратавання роднай зямлі, яе жыхароў, матэрыяльных і духоўных здабыткаў. Сацыяльна-палітычная, арганізацыйная база беларускага нацыянальнага руху пашыраецца. Беды радзімы палохаюць, але і прымушаюць дзейнічаць усе слаі насельніцтва.

Максім Багдановіч яшчэ ў 1915 г. пісаў, што «мы, беларуская інтэлігенцыя, будзем ратаваць наш народ, як ратавалі і дасюль, будзем ратаваць і ў сваім краю, і на чужыне,

памінаючы ў гэтыя грозныя часы абяцанне, каторае ў сэрцы сваім даваў кожны з нас: сілы свае ахвяраваць роднаму краю… . Бо, баронячы наш народ, мы павінны бараніць і нашу культуру» [2].

На рубяжы стагоддзяў колькасць інтэлігенцыі Беларусі ўвесь час расла. Усё больш маладых людзей вучыліся ў вышэйшых навучальных установах Пецярбурга, Масквы, Варшавы, Кіева, Казані, Юр'ева і іншых гарадоў.

Добрай школай палітычнага сталення адукаваных беларусаў была армія. Рэальныя падзеі на фронце зрабілі патрыётамі многіх салдат і афіцэраў, якія сталі актыўнымі ў барацьбе за незалежнасць Беларусі.

Усё больш значнае месца ў развіцці рэвалюцыйнага руху ў гэты час займае Мінск. Тут на месцы Беларускага нацыянальнага камітэта паўстае Рада беларускіх партый і арганізацый, ператвораная затым у Вялікую Беларускую Раду (ВБР); ідэяй нацыянальнага войска паклікана да жыцця Цэнтральная Беларуская вайсковая Рада (БВР).

У сувязі з Кастрычніцкім узброеным паўстаннем у Петраградзе ВБР, іншыя арганізацыі 9 лістапада звярнуліся з «Граматай да беларускага народа», у якой характарызавалася паўстанне як праява анархіі і прагучаў заклік гуртавацца, захоўваць парадак і спакой.

ВБР выступіла з ініцыятывай і разам з Беларускім абласным камітэтам склікала ў Мінску Усебеларускі з'езд [3].

Інфармацыя пра з'езд абляцела не толькі Беларусь, але і тыя рэгіёны Расіі, Украіны, дзе пражывалі бежанцы. Выбары дэлегатаў прайшлі ўсюды, дзе ў нялёгкіх умовах жылі, працавалі, ваявалі беларусы.

Пераадольваючы транспартныя цяжкасці, разруху, беднасць, у Мінск прыехалі і ўдзельнічалі ў рабоце з'езда 1872 дэлегаты, з іх 22% інтэлігенцыі і 716 вайскоўцаў [4].

Гэта сведчыла аб тым, што беларускі народ прачынаецца нацыянальна і імкнецца да дзяржаўнай незалежнасці. І ў той жа час кіраўнікі з'езда разумелі, што імкненне беларусаў да незалежнасці мае шматлікіх праціўнікаў у нацыянальна настроеных рускіх (адзіная і недзялімая Расія з царом ці без цара) і палякаў (Польшча ў межах 1772 года).

Урачыстае адкрыццё з'езда адбылося 7 снежня 1917 г. у атмасферы энтузіязму і радасных падзей. Адкрыў з'езд С. Рак-Міхайлоўскі, публіцыст, педагог. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, педагагічны інстытут у Феадосіі, служыў у арміі, ваяваў. На Румынскім фронце арганізаваў з'езд воінаў-беларусаў. Узначаліў створаную на з'ездзе Цэнтральную вайсковую Раду. Сядзеў у польскіх турмах, вязень канцлагера на Салавецкіх астравах, быў расстраляны ў 1938 г. ў Мінску [5].

Ваенны аркестр зайграў «Марсельезу». Абганяючы падзеі, гучаць воклічы «Няхай жыве Беларуская Рэспубліка!» Хор пад кіраўніцтвам знакамітага музыканта У. Тэраўскага выконвае песні «Ад веку мы спалі», «А хто там ідзе?» на словы Янкі Купалы. З'езд хвілінай маўчання ўшанаваў памяць беларусаў, якія загінулі ў барацьбе за волю.

9 снежня ад фракцый і губернскіх дэлегацый быў выбраны рабочы прэзідыум у складзе 15 чалавек начале з С. Рак-Міхайлоўскім. Ганаровымі старшынямі з'езда сталі акадэмік Я. Карскі і ветэран народніцкага руху А. Бонч-Асмалоўскі. Ён жа зрабіў даклад для дэлегатаў пра зямельную рэформу ў Беларусі [6, 7].

Пра высокі інтэлект і вопыт у розных сферах практычнай работы значнай колькасці дэлегатаў сведчыць выпрацаваная павестка дзейнасці з'езда.

1. Сучаснае палітычнае становішча і лёс Беларусі.

2. Эканамічная разруха і аднаўленне гаспадарчага і эканамічнага жыцця краю.

3. Арганізацыя Беларускай нацыянальнай арміі.

5. Аднаўленне грамадска-культурнага жыцця ў краі. Народная адукацыя.

7. Арганізацыя часовай краёвай улады.

8. Краёвы Устаноўчы сход Беларусі.

Сярод дакладчыкаў былі акадэмік Я. Карскі; доктар тэхналагічных навук В. Іваноўскі; выпускнік Харкаўскага ўніверсітэта, эканаміст М. Гольман; выпускнік Рыжскага політэхнічнага інстытута А. Уласаў; гісторык, публіцыст, вучоны ў галіне эканамічнай геаграфіі Я. Канчар; паэт, архітэктар, выпускнік Пецярбургскага інстытута, французскай акадэміі архітэктуры Л. Дубейкаўскі; генерал К. Кандратовіч і інш. [8].

Дэлегаты размяркоўваюцца па секцыях і камісіях. Кожны мае права і магчымасць выказаць свае меркаванні па рэгіянальных, дзяржаўных справах. З цяжкасцю, але з надзеяй на лепшае праца дае плён. Мабілізацыя сіл відавочная.

Наіўныя дэлегаты не маглі ўявіць, што бальшавіцкія ўлады жорстка разгоняць мірны народны сход, які шукаў шляхі да стварэння сваёй нацыянальнай дзяржавы. Частку делегатаў арыштавалі, але кіруючае ядро з'езда абаранілі рабочыя-чыгуначнікі,

пад аховай якіх у дэпо нейкі час працягвалася праца.

**Заключэнне.** Суровыя абставіны 1917 г. не дазволілі беларускаму народу і яго інтэлігенцыі давесці да жадаемых вынікаў першы ў гісторыі Беларусі дэмакратычна абраны форум і здзейсніць мару лепшых сыноў нашай зямлі – пачаць будаўніцтва сваёй дзяржавы.

### Літаратура

1. Бердяев, М. А. Истоки и смысл русского коммунизма / М. А. Бердяев. – М.: Наука, 1990. – С. 109.

2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 2. – С. 286.

3. Рудовіч, С. Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 167–169.

4. Адамовіч, А. Усебеларускі кангрэс – агульнанацыянальная рэпрэзентацыя / А. Адамовіч // Спадчына. – 1997. – № 3. – С. 24.

5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 2001. – Т. 6. – С. 88–89.

6. Ярушэвіч, Я. А. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка / Я. А. Ярушэвіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 2. – С. 48.

7. Архівы БНР. – Вільня; Нью-Йорк; Менск; Прага, 1998. – Т. 1. – С. 28.

8. Ярушэвіч, Я. А. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка / Я. А. Ярушэвіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4. – С. 50.

*Паступіў 02.04.2010*